# ЯК СТРАШНАЯ ЧОРНАЯ БЕЗДАНЬ…

**Успаміны ўраджэнкі горада Бабруйска, жыхаркі г.п.Вялікая Бераставіца Г. Б. Жалудок**

***Так пачыналася акупацыя***

Вайна застала мяне ў маім родным Бабруйску. Учэпісты дзіцячы розум на ўсё жыццё захаваў усе драбніцы таго чэрвеньскага дня 1941 года. Добра помню, як я, маленькая дзяўчынка, гуляла тады ў сваім садку ля хаты, чакаючы дарослых, каб ісці на шпацыр. Раптам з хаты выйшаў мой дзед, і нават я, дзіця, заўважыла, што ён нечым моцна ўсхваляваны, узрушаны. Прыпыніўшыся на ганку, ён глуха прамовіў:

- Молатаў выступае па радыё. Пачалася вайна з немцамі...

Так я ўпершыню пачула гэтае жудаснае слова, упершыню пачула пра вайну, якая падзяліла маё жыццё, жыццё ўсяго нашага народа на дзве часткі - «да вайны» і «пасля вайны». Страшная чорная бездань вайны пралягла між імі.



*Г. Б. Жалудок.*

Помню, што тады, у першую ноч вайны, мне сніліся самалёты, а прачнуўшыся, я даведалася, што сапраўды на горад быў зроблен першы налёт, скінуты бомбы, ёсць першыя ахвяры.

23-га была такая ж, як і дзень назад, цёплая ясная раніца. Сад зіхацеў ад кропляў расы, але ўжо чутно было ў самім паветры, што набліжаецца вялікая бяда. Гэтае адчуванне яшчэ больш узмацнілася, калі ў траве ля самага ганку я ўбачыла нежывое жоўтадзюбае птушаня - мусіць, яго выкінула з гнязда выбуховая хваля. Мне так стала яго шкада, што я заплакала. Сваім дзіцячым розумам я тады не магла яшчэ дадумацца, што было тое нежывое птушаня нібыта сімвалам лёсу дзяцей у час вайны...

Нас пачалі бамбіць. Людзі спешна капалі ў зямлі сховішчы, у якіх знаходзілі ратунак у час налёту.

Праз горад пацягнуліся на ўсход натоўпы бежанцаў. Мая маці і дзед аднак не рашаліся са мной, з малым дзіцём, выбірацца ў далёкую дарогу. Чакалі бацьку, які быў на той час у Мінску, дзе нядаўна атрымаў кватэру і куды мы павінны былі неўзабаве пераехаць. Бацька вярнуўся дахаты толькі праз тры дні пасля пачатку вайны. Знясілены, у пакрытым дарожным пылам і парваным адзенні, ён расказаў, што дабіраўся да Бабруйска пешшу, што іх, бежанцаў, па дарозе некалькі разоў бамбілі і расстрэльвалі з кулямётаў фашысцкія самалёты.

Мы так і не паспелі ўцячы на ўсход, бо горад у вельмі хуткім часе ўжо быў заняты ворагам. Помню і сваё першае ўражанне ад першай сустрэчы з немцамі. Ля нашага калодзежа спыніліся тры матацыклы з салдатамі. З гучным гогатам фашысты шумна мыліся, абліваліся вадой, дурэлі і

задаволена смяяліся, смяяліся… Па ўсім было відаць, што заваёўнікі вельмі задаволены жыццём і самі сабой.

Першыя дні ў захопленым горадзе немцы займаліся самым нахабным і бессаромным грабяжом. Яны, звычайна групамі, ішлі з двара ў двор, заходзілі ў хаты і бралі ўсё, што кідалася ў вочы. Немцы ў першыя ж дні пастралялі ўсіх сабак у горадзе, каб не брахалі, калі яны завальваюцца ў дзверы.

З'явіліся рабаўнікі і ў нас. Вялі яны сябе вельмі бесцырымонна. Перш-наперш запатрабавалі, як і ўсюды: «Матка, яйкі, шпэк!». А тады ўзяліся самі шукаць. Расчынілі дзверкі кухоннага шкапіка. Там ляжалі яшчэ раней купленыя спецыяльна для мяне цукеркі. Немцы злопалі іх у адзін момант. Потым убачылі слоік з патакай. Тады, да вайны, у нас у Бабруйску на кандытарскай фабрыцы «Чырвоны харчавік» выпускалі такі прадукт, па кансістэнцыі і смаку падобны на цяперашні штучны мёд. Немцы, мусіць, і палічылі патаку за мёд, тут жа пачалі яе з апетытам умінаць. Лыжкі, хоць яны і ляжалі ў шкапчыку, чамусьці не ўзялі, а проста апускалі ў слоік пальцы і аблізвалі іх з гучным цмоканнем. Ліпкія салодкія струмені сцякалі па падбародках, капалі на шэрыя, мышынага колеру салдацкія мундзіры. Аднак салдатам і клопату было мала, яны, як і тады ля калодзежа, гучна рагаталі, забаўляліся. Нам жа на ўсё гэта глядзець было брыдка, няёмка і боязна.

Хутка адзін з немцаў звярнуў увагу на невялікі мяшэчак, у якім бабуля захоўвала крыху пшанічнай мукі. Фашыст ужо хацеў забраць мяшэчак, ды тут у справу ўмяшалася бабуля і praворна пацягнула мяшэчак з учэпістых салдацкіх рук, знакамі паказваючы, што гэта - для дзіцяці, для мяне. Вораг нешта злосна забалбатаў, але мяшэчак усё ж аддаў, рэзка адшпурнуўшы яго назад у шкапчык

Затым яны прыняліся за адзенне Адно грэбліва кідалі на падлогу, іншае забіралі сабе. Помню, самы здаравенны і тоўсты немец вывалак з шафы бацькаву даху, раскошнае цёплае паліто з нейкага незразумелага, нібыта нават з цюленевага футра, купленае бацькам пры выпадку ў сталіцы. Бацька быў шчуплы, а немец - тоўсты, і даха затрашчала, як толькі фашыст яе апрануў, па швах. Убачыўшы гэта, салдаты ледзь не павaліліся ад рогату. А потым выцягнулі з шафы яшчэ і мамін партфель. Была мая маці настаўніцай і насіла са школы дзіцячыя сшыткі ў маленькім і вельмі патрапаным партфельчыку. Вось і купіў ёй бацька ў Мінску да новага навучальнага года вялікі і прыгожы партфель з жоўтай скуры, з двумя вялізнымі і бліскучымі замкамі і яшчэ з нейкімі папругамі, з дапамогай якіх гэтае жоўтае скуранoе цуда можна было яшчэ больш пашырыць. Помню, гэтай рэчы мне тады было яшчэ больш шкада, чым новай і дарагой бацькавай дахі.

Пазней мы бачылі, як па нашай вуліцы гэта група фашыстаў, угінаючыся пад цяжарам награбленага, вярталася са свайго абходу назад. Наперадзе шыбаваў тоўсты немец, у руках у яго быў мамін партфель, распушчаны на ўсю даўжыню раменных папруг. З партфеля відна была гусіная галава на доўгай белай шыі. Гусак раз-адразу гагатаў, як бы падтрымліваючы размову рабаўнікоў. Было і смешна, і крыўдна бачыць гэта.

Той мяшэчак з пшанічнай мукой, які маёй бабулі ўдалося адбіць ад немца, мы непрадбачліва так і пакінулі ў пустым шкапчыку. І паплаціліся за гэта, бо ўжо на наступны дзень забралі немцы і гэтае наша багацце.

Так пачаліся для нас, для мяне дні фашысцкай акупацыі.

### *Тры немцы*

У нашу хату ў акупіраваным Бабруйску, неўзабаве пасля з'яўлення ў горадзе варожых войск, былі прызначаны на пастой тры немцы. Помню, называліся яны Фрыдрых, Отта, Клаус. Фрыдрых быў поўны, нейкі замкнуты і зусім нас ігнараваў. Ён ніколі з намі не размаўляў і праходзіў ля нас так, нібыта мы былі не людзьмі, а рэчамі. Отта быў заўсёды нейкі злы і, калі бачыў нас, то толькі злосна гергетаў нешта на сваёй мове, у яго вачах пры гэтым ясна была відна нянавісць і пагарда да нас. Калі мне трэба было прайсці міма яго, я заўсёды сціскалася ў камячок і старалася прашмыгнуць каля немца паціху і непрыкметна.



***Родны дом Г.Б. Жалудок у г. Бабруйск. 1927 год.***

Да канца жыцця свайго буду помніць абразу і прыніжэнне, якія нанёс мне гэты Отта. Забегшы пад свята Ражаства да бабулі на кухню, я міжволі заглянула ў расчыненыя дзверы пакоя, дзе жылі немцы. Там стаяла ёлка - гэты амаль ужо забыты атрыбут навагодняга свята. Была ёлка ўпрыгожана бліскучымі шарамі і срэбнымі ніткамі - дожджыкам. Але не столькі ёлка, колькі святочны стол прыцягнуў маю ўвагу. Там ляжалі жаўтаватыя бruскі масла, сала, тоўстыя кругі ружовых каўбас, галандскі сыр з дзірачкамі... Ляжалі свежыя яблыкі. У мяне аж вочы разбегліся, але я ведала, што мне глядзець на ўсё гэта няможна і трэба як хутчэй уцякаць адсюль. І сабралася ўжо ісці, як раптам Отта, які сядзеў за сталом, паманіў мяне пальцам: «Ком, кіндар, ком!». Я са здзіўленнем адзначыла для сябе тое, што голас немца быў як бы добразычлівым, і нясмела ступіла крок-другі да дзвярэй.

А Отта тым часам узяў кавалак белага хлеба і пачаў яго намазваць маслам. Мазаў ён павольна і густа, і ўсё глядзеў у мой бок. Потым зноў жа няспешна адрэзаў тоўсты ружовы кругляк каўбасы і пачаў марудна ўціскаць яго ў намазанае масла. Я, як заварожаная, глядзела на павольныя рухі яго кароткапалых рук. А Отта не спяшаўся, ён рабіў сваю справу грунтоўна і павольна, нават марудліва. І ўсё глядзеў у мой бок. «Гэта ён дасць мне?» - білася ў галаве нецярплівае пякучае пытанне.

Уціснуўшы ўрэшце каўбасу ў масла, Отта, усё гэтак жа гледзячы на мяне, раптам кінуў бутэрброд да маіх ног. Толькі цяпер я заўважыла, што ўвесь гэты час ля мяне круцілася наша кошка. Тая, атрымаўшы такі ласунак, задаволена завурчэла і ўпілася ў яго зубамі і кіпцюрамі. А я... горка

заплакала, і, душачыся слязьмі крыўды, кінулася прэч. Услед мне нёсся здзеклівы сыты рогат Отта.

А вось трэці з гэтых немцаў - Клаус - быў зусім не такі. Ён ніколі не крычаў на нас, часта нават размаўляў са старэйшымі і нават са мной. Гаварыў на ламанай рускай мове, але зразумець яго было можна. Спачатку ўсе мы не вельмі давяралі Клаусу. Але паступова ўсё ж прыйшлі да вываду, што ставіцца Клаус да нас упаўне дружалюбна. Ён даваў мне цукеркі, а маме - хлеб і іншыя харчы. А аднойчы ён узяў мяне да сябе на калені, пагладзіў па галаве і сказаў бабулі, што ў яго ў Германіі таксама ёсць маленькая дачка, і я напамінаю яму яе. Пад новы 1943 год Клаус падараваў мне невялічкую штучную ёлачку з зялёнай паперы і з белымі крапінкамі на галінках і чырвоны драўляны падсвечнік. Тыя цацкі доўга зберагаліся ў нашым доме як памяць пра немца, які быў чалавекам.

Аб паражэнні немцаў пад Сталінгредам мы даведаліся ад Клауса. А вось Отта і нават Фрыдрых зусім азвярэлі пасля Сталінграда.

А неўзабаве Клаус паведаміў нам, што іх перакідваюць на фронт. Ён быў вельмі засмучаны гэтым. Ён зусім не хацеў ваяваць супраць рускіх.

… Вось ужо цэлых паўсотні гадоў прайшло з дня пачатку той вайны. І сёння я зноў успамінаю «свайго» немца Клауса. Немца, які ў жорсткі ваенны час даў нам зразумець, што не ўсе немцы былі фашыстамі, не ўсе былі зацятымі нацыстамі. Вельмі хацелася б верыць, што не загінуў Клаус у вогненным віры вайны, выжыў, вярнуўся да сваёй сям'і і ўдзельнічаў у будаўніцтве новай пасляваеннай Германіі.

Галіна Барысаўна Жалудок,
жыхарка г. п. Вялікая Бераставіца,
1991 год.